**Матырка, В.** Служылі два прапаршчыкі / В. Матырка // Лепельскі край. — 2008. — 15 лют. — С. 1.

## СЛУЖЫЛІ ДВА ПРАПАРШЧЫКІ

У Стаpалядненскую школу завіталі ветэраны-інтэрнацыяналісты – колішнія выпускнікі гэтай школы Сяргей Крывель і Сяргей Папко. Яны былі аднакласнікамі, і ў Афганістан трапілі прыблізна ў адзін час. У школе іх гасцінна сустрэла дырэктар Людміла Васюк. Ветэраны былі прыемна ўражаны сучасным знешнім выглядам класаў, усяго будынка. А калі зайшлі ў камп´ютэрны кабінет, то канчаткова прыйшлі да высновы, што ў такой школе трэба вучыцца толькі на самыя высокія адзнакі. Потым мужчыны зайшлі ў класны кабінет, у якім калісьці вучыліся, знайшлі свае парты.

Далейшую размову вялі ў кабінеце дырэктара, успаміналі сваіх школьных сяброў, настаўнікаў. Цікавіліся праблемамі і дасягненнямі сённяшняй школы. Людміла Міхайлаўна расказала пра школьны калектыў – педагогаў і вучняў. Як значную заслугу усёй школы яна ўзгадала той факт, што з апошняга выпуску адзінаццатага класа ўсе паступілі ў вышэйшыя навучальныя установы.

Шмат яна расказала і пра работу на прышкольным участку, дзякуючы якой значна разнастайваецца меню ў школьнай сталоўцы, і пры гэтым яно таннее. Школа вядзе вялікую цімураўскую работу. Вучні даглядаюць магілу воіна-інтэрнацыяналіста Башырава Пра сябе, пра вайну ветэраны распавядалі неахвотна. Але сёе-тое даведацца ўдалося. Сяргей Крывель служыў у наваколлях горада Герата. Прыбыў у Афганістан у ліпені 1982 года, выехаў у канцы снежня 1983-га. Быў прапаршчыкам, камандаваў узводам у мінамётнай батарэі. Батарэя прыкрывала нашы калоны, якія рухаліся па дарозе. На ўзбраенні батарэі меліся 120-мм мінамёты, якія салдаты называлі «самаварамі». Білі «самавары» дакладна. Жылі салдаты на пазіцыі. Спачатку ў палатках, а потым самі сабе пабудавалі глінабітныя домікі-мазанкі. Нават лазню зрабілі, толькі парыліся без венікаў. Баі ў Сяргея былі частай справай, бо душманы абстрэльвалі амаль кожную калону. У адным з баёў ён атрымаў цяжкае ранение. На Новы год параненага вывезлі з Афганістана, і яшчэ доўгіх сем месяцаў потым залечваў раны ў шпіталях. Сяргей Папко таксама службу праходзіў прапаршчыкам. У Афганістане знаходзіўся з кастрычніка 1982 па лістапад 1984 года. Служыў у горадзе Хайратон за сем кіламетраў ад іранскай мяжы. Часць прыбыла, лічы, на пустое месца. Спачатку жылі хто дзе: у палатках, у машынах. За год пабудавалі модулі – аднапавярховыя цагляныя збудаванні. Сяргей Папко год праслужыў начальнікам харчовай службы часці, а другі год – начальнікам сталовай. Як ён сам казаў, вайна для яго была толькі першы год, пакуль хадзіў з калонамі, а потым ішла проста служба. На завяршэнне размовы ветэраны прапанавалі, каб у школе быў зроблены невялікі стэнд, прысвечаны выпускнікам, якія служылі ў Афганістане. Такіх налічваецца пяць чалавек.

**Васіль Матырка**